**РЭФЕРАТ**

Справаздача 308 с., 1 кн., 639 крын.

АГУЛЬНАЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА, ФАЛЬКЛОРНАЯ ТРАДЫЦЫЯ, ТЭОРЫЯ ФАЛЬКЛОРУ, ПРАБЛЕМНА-ТЭМАТЫЧНАЕ ПОЛЕ, МЕТАДАЛАГІЧНЫ ПЛЮРАЛІЗМ, ПОСТСТРУКТУРАЛІСЦКАЯ І ДЭКАНСТРУКТЫВІСЦКАЯ КРЫТЫКА, ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ІНАВАЦЫІ, АНТРАПАЛАГІЗАЦЫЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца фальклярыстычныя ўсходнеславянскія, заходнееўрапейскія, паўночнаамерыканскія навуковыя праграмы.

Мэта – раскрыцццё сутнасці, тэндэнцый, накірункаў фальклярыстычнага вывучэння культуры ў еўрапейска-амерыканскай навуковай традыцыі, а таксама вызначэнне перспектыў развіцця беларускай фальклярыстыкі.

Метады правядзення працы – кантэкстуальна-параўнальны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, храналагічны; актуалізаваны прынцыпы сацыяльна-антрапалагічнага падыходу.

У працэсе працы вызначаны асаблівасці трактоўкі шэрагу праблем тэорыі фальклору, метадалагічных прынцыпаў пабудовы яго канцэпцый, інвентарызаваны падыходы да вызначэння фальклярыстыкі як навуковай дысцыпліны, яе месца і ролі ў сучасных сацыяльна-гуманітарных ведах. У выніку даследавання ўпершыню беларускай фальклярыстыцы яе праблемна-тэматычнае і тэарэтыка-метадалагічнае палі ўпісаны ў парадыгму сучасных еўрапейска-амерыканских сацыяльна-культурных ведаў, прапанаваны напрамкі адаптацыі тэарэтычных інавацый да даследавання шматстайнасці форм і тыпаў фальклорнага ўжытку, механізмаў "натуральнай камунікацыі", вернакулярнай культуры беларусаў. Вынікі даследавання ўкаранёны ў адукацыйны працэс устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь, што дазваляе павысіць узровень прафесійнай кампетэнцыі педагогаў-філолагаў і кіруючых работнікаў устаноў культуры, забяспечыць іх найноўшымі навуковымі ведамі пра развіццё замежнай фальклярыстыкі, развіць міжкультурныя кампетэнцыі. Вынікі даследавання сталі падставай для падрыхтоўкі двух ВМД і ВМК "Фальклярыстыка" для студэнтаў філалагічнага факультета, лекцый п фальклярыстыцы, міфалогіі, літаратуразнаўстве, а таксама для стварэння абагульняльных прац, у якіх тэарэтычныя інавацыі еўрапейска-амерыканскай фальклярыстыкі адаптаваны да рэалій айчыннай навукі і культуры. Атрыманыя вынікі могуць быць развіты ў накірунку абнаўлення аналітычнай канцэпцыі беларускага фальклору ў сувязі са структурным і змястоўным ускладненнем аспектаў вывучэння фальклорнага працэсу, з улікам розных сацыяльных і ідэалагічных узроўняў яго рэцэпцыі.